**Гунева Т.М.,** студ. гр. 235к БДУКМ
Навук. кір. – Вайцэховіч Н.Ю.,
кандыдат педагагічных навук

# ЦУДОЎНЫ МІР КНІГІ СУПРАЦЬ ЭЛЕКТРОННАГА ДАКУМЕНТА Ў СІСТЭМЕ БІБЛІЯТЭКІ

*Любіце кнігу ўсёй душой.*
*Яна не толькі ваш лепшы сябар, але і да канца верны спадарожнік*
Міхаіл Аляксандравіч Шолахаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кніга як гучыць гэтае слова! Яна, сапраўды, з’яўляецца скарбніцай нашых ведаў. Менавіта праз кнігу, праз яе цудоўны мір мы адкрываем для сябе Сусвет. На працягу многіх стагоддзяў кніга суправаджала чалавека, дапамагала яму ў розных бедах, была самым лепшым сябрам. Кніга сваім светам і новымі ведамі прыцягвае, адлюстроўвае ў розуме пэўны вобраз, пейзаж альбо абставіны… На сучасным этапе для чалавека з’явіўся новы спадарожнік – электронны дакумент.

І для таго, каб разумець, якое месца ў жыцці кожнага чалавека займае кніга альбо электронны дакумент, трэба звярнуцца да азначэння гэтых паняццяў і разгледзіць іх у гістарычным аспекце.

Вызначэнне тэрміна “кніга” – гэта складаная навуковая праблема. На сенняшні дзень не існуе адзінага паняцця “кніга”, паколькі многія даследчыкі лічаць, што на розных этапах паняцце “кніга” мае сваё азначэнне.

Такім чынам, паспрабую дать некалькі азначэнняў  паняццю “кніга” і “электронны дакумент” для разумення. Адно з настарэйшых азначэнняў кнігі адносіцца да 1740 года, якое прыводзіць Яўген Неміроўскі з французкага “Вялікага гістарычнага слоўніка”:

“Кніга” – збор некаторай колькасці аркушаў злучаных разам , на якіх што-небудзь напісана ці надрукавана [1; с. 8].

М. Куфаеў лічыць, што “кніга” з’яўляецца прадуктам чалавечай творчасці і ўяўляе сабой збор аркушаў з рукапісным і друкаваным тэкстам [1; с. 8].

“Кніга” – адзін з відаў друкаванай прадукцыі: неперыядычных выданняў, якое складаецца з папяровых лістоў (старонак) або сшыткаў, на якіх нанесеная друкарскім або рукапісным спосабам тэкставая і графічная (ілюстрацыі) інфармацыя, якая мае аб'ём больш за сорак васьмі старонак і, як правіла, цвёрды пераплёт.

На сучасным этапе даннае азначэння паняцця кнігі з’яўляецца больш актуальным.

Але ўсе ж такі трэба звярнуцца да гісторыіі стварэння кнігі.

Кніга ўпершыню з’явілася ў старажытныя часы, а менавіта ў раёне Двурэчча – вобласці ў сярэднім і ніжнім працягу рэк Тыгар і Еўфрат. Матэрыялам для пісьма служыла гліна. Гліняныя таблічкі былі знойдзены на месцы былога пасялення шумераў, у раёне гарадоў Ура і Кіша.

Паколькі мы ведаем, што кніга друкуецца на пареры, то вось гісторыя закідвае нас у Старажытны Егіпет, дзе кніга мела від павіруснага світка, які быў вядомы на ўвесь старажытны мір .

Як лічылі егіпцяне, папірус – гэта “скарб ракі” на якім пісаліся розныя іерогліфы.

Кнігі ў Егіпце называліся “душы Ра”- гэта значыць., кнігі магічнай сілы егіпіцкага Бога Ра [2; с. 7 – 9].

Вось з гэтага гістарычнага аспекта бачна, што ў тыя часы надавалася вялікае значэнне кнізе.

У Беларусі кніга таксама мела вялікае значэнне, па-першае ў старажытныя часы яна мела больш рэлегійны характар. Асноўныя прадстаўнікі, якія займалія кніжнай і асветніцкай дзейнасцю на Беларусі, былі Еўфрасінія Полацкая, Францыск Скарына, Сымон Будны і інш.

Але, калі разглядаць сучасны этап, то кніга страчвае сваю актуальнасць з паяўленнем электроннай кнігі . Уся большая частка людзей выбірае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

электронную кнігу, паколькі яна больш зручная, чым традыцыйная. Для таго каб разумець, што такое электронная кніга, звернімся да азначэння:

“Электронная кніга” – версія кнігі ў электронным (лічбавым) выглядзе. Дадзены тэрмін ужываецца як для твораў, прадстаўленых у лічбавай форме, так і ў дачыненні да прылад, якія выкарыстоўваюцца для іх чытання.

Такім чынам , мы бачам, што электронная кніга- гэта аналаг традыцыйнай кнігі.

З узнікненнем новых тэхналогій з’явіўся шэраг праблем па стварэнню і развіццю бібліятэк з традыцыйнымі носьбітамі. На сенняшні дзень бібліятэка як скарбніца нашых багаццяў страчвае свой аўтарытэт. Калі раней бібліятэка выступала месцам асветы і навкі, то цяпер існуе ў сістэме новых тэхналогій.

Усе больш і больш ствараюцца электронныя бібліятэкі, альбо доступ да дакументнага патоку ажыцяўляецца праз удалённы доступ карыстальнікаў. Сапраўды, інавацыіі з’яўляюцца зручнымі і вельмі прывабнымі да карыстальнікаў, але пры такім выкарыстанні страчваецца камунікацыіі людзей. Таксама ў замежных краінах існуюць думкі стварэння электронных бібліятэк ,дзе будзе прысутнічаць электронная форма дакументаў, а традыцыйная кніга не будзе выкарыстоўвацца.

Адрозненні электроннай бібліятэкі ад традыцыйнай заключаюцца, перш за ўсё:

– у тэхналагічных працэсах фарміравання інфармацыйнай прадукцыі , а таксама складзе сродкаў, якія выкарыстоўваюцца для яе захоўвання і прадастаўлення карыстальнікам;

– у відах носьбітаў: фонд электроннай бібліятэкі камплектуецца толькі лічбавымі рэсурсамі, тады як традыцыйная бібліятэка ўключае друкаваныя выданні і рэсурсы на іншых носьбітах;

– у арганізацыйных формах стварэння і функцыянавання: традыцыйныя бібліятэкі з'яўляюцца юрыдычнымі суб'ектамі або структурнымі элементамі арганізацый, у склад якіх яны ўваходзяць .

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У той ці іншай форме ідэя электроннай бібліятэкі ўжо працуе ў многіх універсітэтах і буйных бібліятэках вядучых краін свету. Напрыклад, «Электронная бібліятэка XXI стагоддзя» ствараецца ў Японіі шляхам злучэння намаганняў Агенцтва па ўкараненні новых тэхналогій, Нацыянальнай парламенцкай бібліятэкі, шэрагу міністэрстваў, больш за 20 бібліятэк і культурных цэнтраў.

Некалькі гадоў таму Бібліятэка Кангрэса ЗША пачала рэалізацыю нацыянальнай праграмы стварэння электроннай бібліятэкі. Пачынаючы з 1994 года па ініцыятыве NSF, DARPA і NASA у ЗША была разгорнута даследчая праграма Digital Libraries Initiative (DLI) па электронным бібліятэкам.

Электронныя бібліятэкі становяцца неад'емнай часткай дзейнасці практычна ў любой вобласці. З неабходнасцю мець, развіваць і выкарыстоўваць электронную бібліятэку сёння сутыкаюцца практычна ўсё.

Электронныя бібліятэкі дазволяць карэнным чынам змяніць сам прынцып інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў: звяртаючыся да сістэмы, яны будуць атрымліваць не толькі спасылку (бібліяграфію ці рэферат) на існуючы электронны дакумент, але і сам дакумент (поўную копію арыгінальнай артыкула, аўтарэферат дысертацыі, графічны вобраз карціны або тэхнічнага чарцяжа, відэазапіс праведзенага даследавання або экскурсіі па музеі і т. д.) [3].

Такім чынам, аналіз сучаснага стану ў галіне стварэння і выкарыстання электронных бібліятэк паказвае , што электронныя выданні не замяняюць друкаваныя, а пашыраюць магчымасці працы карыстальнікаў з інфармацыяй [3]. Многія спецыялісты лічаць што, традыцыйная кніга будзе выкарыстоўвацца толькі для ацыфроўкі і перавядзення ў электронны фармат.

Мая кропка гледжання такая: традыцыйная кніга павінна заставацца і выкарыстоўвацца ў поўнай меры карыстальнікамі бібліятэкі. Але гэта ўсе залежыць ад развіцця грамадства, новых інфармацыйных тэхналогій, і ўкараненні іх у грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кніга перадае ўсе пачуцці, і адчуавнні, якія аўтар хоча данесці да нас. Папяровую кнігу як мінімум прыемней проста трымаць у руках. У параўнанні з імі нават самыя наварочаныя рыдэр застаюцца бяздушнымі лядоўнямі жалязякамі. Акрамя таго, папяровыя кнігі ўспрымаюцца як асабістая ўласнасць. Чалавеку ўласціва прывязвацца да экземпляра любімай аповесці або патрапанага томіку вершаў .

Ці змогуць электронныя кнігі супернічаць ў гэтым з папяровымі? Магчыма, пытанне толькі ў тым, наколькі гэта трэба. Цалкам верагодна, што праз нейкі час мы пачнем з падобнай настальгіяй ставіцца да вылучаных фрагментаў і нататак , які запомніў наш рыдэр, калі мы яшчэ вучыліся ў інстытуце, і магчымасці лёгка і хутка ўсё гэта знайсці .

Такія рэчы, як вокладка, пераплёт і шрыфт, з дапамогай электроннай кнігі не робяцца. Пераплёт і шрыфт звычайна вельмі старанна выбіраюцца выдаўцом. Само сабой, што гэта прыкметна вызначае хоць бы першае ўражанне чытача ад кнігі.

Магчымасць распаўсюджвання. Тых з нас, каму яшчэ прыемна атрымаць кнігу ў падарунак, пацешаць і ўсялякія надпісы ад дарыльшчыка. Натуральна, зрабіць нешта аналагічнае ў электронным фармаце праблематычна.

Захоўванне. Пытанне абароны ад капірвання і несумяшчальнасці фарматаў вызначае магчымасць не толькі капірвання , але і будучыні доступу да кніг. Хто можа з упэўненасцю сцвярджаць , што набытую сёння электронную кніжку можна будзе захаваць і перачытаць гадоў праз дзесяць?

Наогул кажучы, нешта падобнае можа здарыцца і з папяровымі кнігамі. Іх можна страціць пры пераездзе або аддаць сябрам, якія забудуць іх вярнуць. Тым не менш вытворцам варта заклапаціцца пытаннем магчымага захоўвання электронных кніг, калі яны сапраўды хочуць заваяваць сэрцы пакупнікоў.

Але як бы сумна не было, электронны дакумент мае перавагу перад традыцыйнай кнігай. Але хочацца таго каб не здарылася ў будучым так, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалавецтва страціла ўсе традыцыйныя кнігі, а засталася толькі адна – Біблія, напісанная шрыфтам Брайля.

Кожны выбірае для сябе, адкуль атрымліваць веды, альбо з электроннага дакумента, альбо са скарбніцы многіх вякоў, цудоўнай і блізкай да сэрца кнігі.

---

1. Доўнар, Л.І. Гісторыя беларускай кнігі : вучэб. дапам. / Л.И. Доўнар; Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, БДУКМ. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 252 с.

2. Шомракова, И.А. Всеобщая история книги / И.А. Шамракова, И.Е. Баренбаум ; СПбГУКИ. – Санкт-Петербург : Профессия, 2005. – 368 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ